Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# ДОБРУШСКІ КРАЙ

16 студзеня 2013 года
Серада

№5 (10221)

**МЕРАПРЫЕМСТВЫ**

# Каляда — госця жаданая



З года ў год папулярнасць Старога Новага года расце. Людзі пачалі ставіцца да яго як да самастойнага свята, якое працягвае характво навагодніх вечароў. Як і ў даўнія часы, дарослыя і дзеці чакаюць з нецярпеннем вячэрняга часу калядавання, калі па поўным праве можна пабегаць па дамах суседзяў, сяброў, родзічаў ці проста незнаёмых людзей і пакалядаваць. А яшчэ Калядкі традыцыйна адзначаюцца масавымі гуляннямі і разнастайнымі забавамі.

**(Заканчэнне – на 4 с.)**

**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

## Поздравляем!

### Уважаемые жители Гомельской области!

Гомельские областной исполнительный комитет и областной Совет депутатов сердечно поздравляют вас с 75-летием образования области!

Прошедшие три четверти века вместили в себя много событий, которые стали вехами в судьбе области и республики. Они опалены пламенем жестокой борьбы с иноземными захватчиками, прославлены замечательными свершениями наших предшественников.

Сегодня Гомельская область – это регион с высоким потенциалом промышленности и аграрного сектора, развитой системой образования и науки, неоспоримыми достижениями в культуре и спорте.

Все это стало результатом труда нескольких поколений наших сограждан. Именно они, труженики региона, люди талантливые, образованные, деятельные, во все времена были главным достоянием Гомельского края.

Убеждены, что традиции созидания будут продолжены, жители области впишут немало новых, достойных страниц в историю Гомельщины и Беларуси, внесут вклад в укрепление ее благосостояния.

Здоровья, бодрости духа и долголетия желаем нашим дорогим ветеранам. Мы гордимся вами, вашими победами.

Ярких открытий, высоких достижений, светлых помыслов грядущему поколению.

Счастья, благополучия и добра всем жителям Гомельской области!

**С праздником, дорогие земляки!**

**В.А. ДВОРНИК,**
**председатель областного исполнительного комитета**
**М.А. БОНДАРЬ,**
**председатель областного Совета депутатов**

**К сведению добрушан и гостей города!**

19 января 2013 года на реке Ипуть в районе спасательной станции в Добруше состоится Великое водосвятие в честь праздника Богоявления Господне.

**Приглашаем всех желающих.**

**У КРАІНЕ**

### АПТЫМІЗАЦЫЯ Ў ДЗЯРЖОРГАНАХ БЕЛАРУСІ ЗАКРАНЕ 13 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК І ЗЭКАНОМІЦЬ 1 ТРЫЛЬЁН БЕЛАРУСКІХ РУБЛЁЎ НА ЗАРПЛАТАХ ЧЫНОЎНІКАЎ

**Аб гэтым прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч заявіў 11 студзеня на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы па аптымізацыі структуры, колькасці і функцый дзяржаўных органаў, паведамілі ў Прэс-службе беларускага лідара.**

«Паводле разлікаў Міністэрства фінансаў, гадавая эканомія па фонду аплаты працы, выкліканая скарачэннем дзяржапарату, складзе Br1 трлн. у бягучых цэнах», – гаворыцца ў паведамленні Прэс-службы.

Як адзначыў Міхаіл Мясніковіч, праведзены ў 2012 годзе ў Апараце ўрада пілотны праект па скарачэнню колькасці паказаў, што практычна гэтыя пытанні вырашаюцца на працягу паўгода.

Разам з тым, паводле слоў прэм'ер-міністра, беларуская сістэма дзяржкіравання не вялікая і не дарагая, асабліва ў параўнанні з іншымі дзяржавамі. «У супастаўных з нашай краінай па насельніцтву і тэрыторыі дзяржавах, такіх як Аўстрыя, Славакія, Балгарыя, колькасць цэнтральных апаратаў міністэрстваў без уліку супрацоўнікаў сілавых ведамстваў і агульная колькасць чыноўнікаў у 1,5-2 разы вышэйшая, чым у Беларусі», – адзначыў прэм'ер.

У Беларусі таксама значна ніжэйшыя расходы на дзяржаўнае кіраванне. Так, удзельная вага ў ВУП на ўтрыманне дзяржапарату ў Беларусі складае ўсяго 1,2 працэнта, што ў разы ніжэй, чым у шэрагу еўрапейскіх краін. Аналагічна і з колькасцю работнікаў дзяржорганаў. У Беларусі без уліку супрацоўнікаў сілавых ведамстваў іх 56 тыс., у той час як у Славакіі – 66 тыс., а ў Аўстрыі – 85 тыс.

Удзельная вага колькасці занятых у органах дзяржкіравання да колькасці занятых у эканоміцы ў Бельгіі складае 8,9 працэнта, Грэцыі – 8,8 працэнта, Венгрыі – 7,8 працэнта, Балгарыі – 7,6 працэнта, амаль 6,5 працэнта ў Чэхіі і Партугаліі. У той жа час у Беларусі гэты паказчык складае толькі 3,6 працэнта.

Кампактнасць існуючага дзяржапарату пацвярджаецца і ў параўнанні з БССР. Колькасць работнікаў цэнтральных дзяржаўных органаў у той час параўнальная з колькасцю занятых у органах дзяржкіравання ў сучаснай Беларусі. Пры гэтым трэба ўлічваць, што тады многія пытанні вырашаліся ў Маскве, як сталіцы СССР, а таксама існаваў партыйны апарат, адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

**БелТА**

**17 января 2013 года**
в здании Добрушского районного исполнительного комитета по ул. князя Ф.И.Паскевича, 11 будет проводиться прямая телефонная линия по телефону **3-00-01 с 10.00 до 11.30,** личный прием граждан **с 11.30 до 13.00** первым заместителем председателя Комитета государственного контроля Гомельской области
***Тарановым Константином Ивановичем***
**Предварительная запись**
граждан на прием будет осуществляться по телефону **3-12-10**

ISSN 2073-1000

**ПОГОДА**

**Долгота дня 8.14**
**Луна**
**16 января — в Рыбах, 17, 18 — в Овне**

**Первая четверть 19 января**

**17 января**
**НОЧЬЮ 0…+2**
**ДНЕМ около 0**
Сплошная облачность.
Сильный мокрый снег.
Ветер южный, 3-5 м/с

**18 января**
**НОЧЬЮ около 0**
**ДНЕМ около 0**
Сплошная облачность.
Небольшой снег.
Ветер западный, 3-5 м/с

В ОБЛИСПОЛКОМЕ

# Пора включаться в работу,
## или Горькая расплата за пьяные пожары

**В 2012 году предприятия Гомельской области практически всех отраслей (за исключением строительной) работали стабильно, добившись в результате лучших, чем в позапрошлом году, экономических показателей. Однако останавливаться на достигнутом нельзя. В наступившем году Гомельщина должна еще прибавить в каждой отрасли. На этом сделал акцент вчера на еженедельном аппаратном совещании в облисполкоме губернатор Владимир ДВОРНИК.**

**ЧРЕЗВЫЧАЙНЫЕ СИТУАЦИИ** В наступившем году на Гомельщине в огне погибли 6 человек, проинформировал **начальник областного управления МЧС Юрий Парфененков.** При этом все они в момент трагедии находились в состоянии алкогольного опьянения. В прошлом году 78% погибших стали жертвами пьяных пожаров. В их числе как постоянно злоупотребляющие алкоголем люди, так и внешне благополучные, социально устроенные граждане. Подразделения МЧС в нынешнем году возьмут эти категории граждан под усиленный контроль. "Профилактическая работа должна быть постоянной, — подчеркнул председатель облисполкома и предложил: — Нужно продумать возможность установки в домах, где живут неработающие, злоупотребляющие спиртными напитками люди, автономных пожарных извещателей с выводом сигнала на фасады зданий. Это не только сохранит жизни, но и будет иметь психологическое воздействие. Возможно, люди задумаются над своей судьбой и захотят наконец что-то изменить. А наша задача — помочь им в этом".

**Уже в нынешнем году в области на пожарах погибли 6 человек. Все они в момент трагедии находились в состоянии алкогольного опьянения.**

**ПРАВОПОРЯДОК** Житковичский и Жлобинский районы станут своего рода экспериментальными площадками, где будет внедрен единый алгоритм совместных действий правоохранительных органов, местной власти и общественности по улучшению криминальной ситуации. Об этом сообщил **начальник УВД облисполкома Валерий Полищук.** Традиционно в этих регионах больше совершается преступлений и правонарушений. Районные отделы внутренних дел планируется обеспечить всем необходимым для работы, в том числе полностью укомплектовать участковыми инспекторами милиции. К трудоустройству и социальной адаптации неработающих граждан, ведущих асоциальный образ жизни, подключатся сельские советы, органы соцзащиты, образования, здравоохранения.

В ходе рейдов по объектам АПК Октябрьского, Петриковского, Чечерского районов по-прежнему выявляются факты нарушения трудовой дисциплины и бесхозяйственного отношения к общественному имуществу. Владимир Дворник, обращаясь к начальнику отдела по координации деятельности административных органов и военно-мобилизационной работе облисполкома Владимиру Кравцову, потребовал принципиального и строгого отношения к руководителям предприятий, где систематически совершаются кражи или выявляются факты бесхозяйственности.

**ЭКОНОМИКА** На предприятиях области сокращаются складские запасы готовой продукции, рассказал **первый заместитель председателя комитета экономики облисполкома Андрей Конюшко.** К концу прошлого года уровень запасов вошел в нормативный параметр 59% и составил 54,5% среднемесячного производства. Значительно разгрузили свои склады ОАО "Гомельагрокомплект" и предприятия холдинга "Мясо-молочная компания".

Проанализированы прогнозы экономического развития области в январе. Ряд предприятий, в том числе крупных промышленных в областном центре, пока уверенно не стартовали. Владимир Дворник поручил председателю Гомельского горисполкома Петру Кириченко проанализировать ситуацию: "Новогодние праздники прошли, пора включаться в работу и наверстывать упущенное. Задача для всех одна — добавить как минимум 5% объема производства в натуральном выражении к уровню прошлого года".

**СЕЛЬСКОЕ ХОЗЯЙСТВО** Районы области приступили к защите своих программ по растениеводству и животноводству на 2013 год. Многие требуют доработки, отметил **первый заместитель председателя комитета по сельскому хозяйству и продовольствию облисполкома Сергей Евдокимов.** Группы специалистов облсельхозпрода также выезжают в районы для оказания методической помощи хозяйствам, имеющим проблемы в животноводстве, в частности, производстве молока. Продолжается подготовка к посевной кампании, решаются вопросы с обеспечением организаций АПК области удобрениями в необходимых объемах, ремонтируется техника.

**Елена АЛЕНЧЕНКО**

УДЗЯЧНАСЦЬ

**Нядаўна на адрас рэдакцыі прыйшоў цікавы ліст. У ім Галіна Барадзіна і Наталля Вольская выказваюць словы шчырай падзякі кіраўніку курсаў "У нагу з часам" Т. Канавалавай, яе памочнікам Н. Пахомавай і А. Тулупавай. Работнікі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнай абароны насельніцтва зрабілі ўсё магчымае, каб наведвальніцы курсаў засвоілі азы камп'ютарнай граматы.**

# У нагу з часам

– Гэта дазволіла нам, – дзеляцца сваімі ўражаннямі жанчыны, – прыахвоціцца да наведвання сусветнай "павуціны". Пасля вучобы мы набылі ноўтбукі і дома ўжо самастойна блукаем па прасторах інтэрнэта. Зараз мы можам знайсці старыя любімыя фільмы, чытаем кнігі, якіх пакуль няма ў бібліятэках, шукаем сваіх аднакласнікаў і аднакурснікаў, перапісваемся з імі і кантактуем з дапамога Skype. Дзякуючы магчымасцям інтэрнэта можна паглядзець на дарагія нашым сэрцам месцы, дзе мы былі шмат год назад. Віртуальна наведаць тыя краіны, якія мы наўрад ці наведаем калі-небудзь.

– З дапамогай інтэрнэта, – пішуць жанчыны, – мы пашыраем свой кругагляд, узбагачаемся духоўна. Неверагодна, але факт – не пакідаючы сцен сваёй кватэры, спадарожнічаем у віртуальнай прасторы і вельмі ўдзячны работнікам тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання за тое, што з іх дапамогай мы перасталі адчуваць межы і адлегласці. Вялікі ім дзякуй!

**Падрыхтаваў Леанід ДУБОЎСКІ**

КОРАТКА

## З нетраў Венесуэлы

Беларуска-венесуэльскае сумеснае прадпрыемства «Петралера БелаВенесалана» ў 2012 годзе здабыло ў Венесуэле 1,1 млн тон нафты і 790 млн куб.м газу. Непасрэдна з беларускіх нетраў у 2012 годзе было здабыта 1,66 млн тон нафты І 213 млн куб.м газу.

ОБРАТНАЯ СВЯЗЬ

# Требующие внимания

*Работа с обращениями граждан является одним из критериев оценки деятельности руководящих кадров нашего района. Согласно действующему законодательству по обращениям граждан во всех структурных подразделениях райисполкома, осуществляющих прием граждан, определен единый распорядок работы специалистов, ответственных за выполнение административных процедур, организованы единые дни личного приема председателем райисполкома. Разработаны графики проведения приема граждан по личным вопросам руководством райисполкома, а также осуществляются приемы граждан в сельских и поселковом исполкомах. О том, насколько результативной была работа в прошлом году, пойдет разговор с заведующей сектором по работе с обращениями граждан и юридических лиц райисполкома Марией Николаевной Мостовенко.*

**– Какие вопросы чаще всего поднимали добрушане и жители района в обращениях в райисполком и вышестоящие органы в 2012 году?**

– Из анализа обращений по тематическому содержанию следует, что в отчетном году увеличилось количество вопросов по коммунальному и дорожному хозяйству. Это ремонт дорог, подтопление, благоустройство, а также другие вопросы жилищно-коммунального хозяйства, к которым относятся: урегулирование температуры воздуха в жилом помещении или урегулирование температуры воды. Также это уличное освещение, ремонт и строительство надворных построек, ремонт системы водоснабжения и другие. Актуальным вопросом для населения остается жилищный вопрос: предоставление жилья и его приватизация.

**– Увеличилось ли число обращений от граждан в вышестоящие органы?**

– В 2012 году районным исполнительным комитетом было рассмотрено 353 обращения граждан и юридических лиц. Из них 150 были поданы в устном порядке и 203 – в письменном виде. В сравнении с 2011 годом общее количество обращений уменьшилось на 33,7 процента, письменных на 33,5 процента и устных на 34 процента.

В сельисполкомы и поселковый исполком за 2012 год поступило 785 письменных и устных обращений граждан, что на 725 (92,3 процента) обращений меньше по сравнению с соответствующим периодом прошлого года.

**– Мария Николаевна, как известно, люди зачастую, минуя районные органы власти, адресуют свои обращения руководству области или республики…**

– Да, это действительно так. 27 процентов от письменных обращений, поступивших в райисполком в 2012 году, – это обращения из вышестоящих государственных органов. В сравнении с 2011 годом данная цифра уменьшилась на 62 обращения.

Обращения, поступившие на рассмотрение в райисполком из Гомельского облисполкома за 2012 год, составили 12,3 процента или 25 обращений от всех поступивших в райисполком письменных обращений, что на 35 обращений меньше в сравнении с 2011 годом.

**– А как обстоят дела с рассмотрением обращений граждан?**

– Из поступивших 353 письменных и устных обращений в 2012 году по 203 даны разъяснения, по 11 отказано, 82 разрешены положительно, 57 находятся на контроле.

Однако, несмотря на то, что 23 процента обращений разрешены, 16 процентов обращений находятся на контроле. Это капитальный ремонт домов № 12 по переулку Крылова, № 1 по улице Кирова; это вопросы предоставления жилья гражданам, находящимся на очереди; это водоснабжение и газификация жилых домов по улице Плеханова в Добруше. Также это реконструкция и водопонижение мелиоративной системы райцентра, реконструкция спортивного стадиона, капитальные ремонты домов и другие.

Нужно отметить, что в 2012 году в райисполком поступило от инвалидов и участников Великой Отечественной войны 8 обращений, инвалиды общего заболевания обращались по волнующим вопросам 25 раз, многодетные семьи – 10, одинокие матери – 9.

В 2012 году в райисполком поступило 26 повторных обращений, 32 коллективных и 1 анонимное. Таким образом, произошло уменьшение и в данной категории обращений.

10 обращений поступило по электронной почте. Из них по 7 даны разъяснения, 2 – удовлетворено, 1 – находится на контроле.

**– Если у жителя города или района возникнет вопрос, в разрешении которого необходима будет помощь руководящей вертикали района, то какими путями он сможет его разрешить?**

– В райисполкоме, как и раньше, организована предварительная запись на прием к председателю, заместителям и управляющему делами райисполкома по телефону или при личном обращении гражданина. При изменении порядка приема, граждане уведомляются об этом заблаговременно. А также по предварительной записи производится оперативное разрешение поступивших вопросов заместителями председателя по принадлежности.

В райисполкоме продолжается работа прямых телефонных и горячих линий. Еженедельно жители района имеют возможность получить профессиональное разъяснение по интересующим их вопросам во время проведения прямых телефонных линий руководителями структурных подразделений райисполкома и районных служб, о чем заранее информируются через районную газету.

Итоги работы с обращениями граждан ежеквартально рассматриваются на заседаниях районного исполнительного комитета, а также еженедельно на оперативных совещаниях у председателя райисполкома, где детально анализируется состояние исполнительской дисциплины с изучением причин, способствующих возникновению обоснованных жалоб, и принятием мер по их своевременному устранению.

**Полина БЫКОВСКАЯ**

ЧЕЛОВЕК ДЕЛА

# Профессии прекрасней нет на свете...



**Настоящим наставником может быть только тот человек, который по зову сердца, по велению души, по глубокому призванию стал учителем. Именно таким преподавателем на протяжении вот уже 18 лет для учащихся Добрушской гимназии является ее директор Старостенко Владимир Петрович – руководитель, который внес огромный вклад в развитие школы, в обеспечение достойного уровня воспитания и образования подрастающего поколения. Руководитель, благодаря которому гимназия стала одной большой дружной семьей, где между учениками и преподавателями царит атмосфера уюта и взаимопонимания.**

**Всегда подтянутый, в строгом костюме и галстуке, с едва заметной улыбкой в глазах, на первый взгляд он может показаться очень серьезным, важным преподавателем. Но в душе Владимир Петрович очень интересный, разносторонне развитый, творческий человек, после общения с которым всегда остаются только самые положительные эмоции. Вот и мне посчастливилось получить дозу безграничного позитива и одновременно узнать о нашем талантливом руководителе немного больше.**

**– Владимир Петрович, можете ли рассказать что-нибудь о Вашей школьной жизни, о детстве?**

– О, это такая прекрасная и невозвратная пора, что не хватает сил вернуться в то время без ностальгии и сожаления, что она навсегда потеряна.

**– В этот период Вы мечтали о чем-нибудь романтичном, может несбыточном?**

– Возможно покажется странным, но к 9-му классу я для себя осознал, что высшей человеческой ценностью, мечтой, сокровищем и богатством является настоящая любовь – это создание семьи с человеком, у которого такие же жизненные ценности, душа, сердце...

**– Скажите, что повлияло на Ваш выбор профессии?**

– Я окончил школу в период расцвета индустриальной эпохи. Такие слова, как «техника», «инженер», «космос», «физика» были на слуху у молодежи... Я поступил на физический факультет университета.

**– А каким, на Ваш взгляд, должен быть девиз в воспитании детей?**

– Ребенок – это человек, только маленький.

**– По многим показателям наша гимназия занимает первые места. Скажите, что помогает добиваться таких результатов?**

– Высшая ценность гимназии, школы не в высоких количественных показателях, а в том, как эти детские учреждения оправдывают ваши надежды в становлении вас как личности.

**– Добросовестный, сплоченный коллектив – залог успеха учреждения образования. А какими критериями руководствуетесь Вы, подбирая учителей в команду?**

– У нас нет конкурсного набора педагогов. Наше счастье в том, что в коллективе работают ответственные профессионалы. Они и определяют лицо гимназии. И когда на работу приходят молодые специалисты, им есть у кого учиться.

**– Каким тогда должен быть идеальный ученик?**

– Я уже говорил, что ученик – это маленький человек. А человек всегда кого-то любит, и есть люди, любящие его. Любящий человек и любимый человек. Что может быть прекраснее и идеальнее?

**– Не могу не согласиться. А можете ли Вы вспомнить ученика или учеников, которые по-настоящему удивили. Что это были за эпизоды?**

– Больше всего меня удивляете вы все. Выпускники гимназии впитывают столько информации, знаний, что мне в ваши годы и не снилось!

**– Вы стали обладателем Гран-при областного конкурса профмастерства. С какими пожеланиями хотели бы обратиться к своим коллегам, чтобы помочь им в достижении профессионального успеха?**

– Уважение, внимание, благодарность учеников и их родителей – это и есть настоящие ценности для педагога-профессионала. Остальное – надуманное.

**Елена ПРОКОПЦОВА**

АКЦЫІ

**У студзені бягучага года ўзяла старт раённая метадычная акцыя “Педагогі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі – маладым спецыялістам”. Яна працягнецца да канца навучальнага года. У маі будзе праведзена анкетаванне і падвядзены вынікі.**

**Як адзначыла загадчыца метадычнага кабінета аддзела адукацыі райвыканкама Святлана Кавалёва, акцыя мае мэту выкарыстання патэнцыялу настаўнікаў вышэйшай катэгорыі і пераймання вопыту іх педагагічнай дзейнасці маладымі педагогамі.**

# Узнагароды знойдуць пераможцаў

– Кожная ўстанова адукацыі нашага раёна на працягу другога паўгоддзя 2012-2013 навучальнага года прадставіць шэраг метадычных мерапрыемстваў, – адзначыла Святлана. – Сюды ўвойдуць майстар-класы і кансультацыі па розных вучэбных прадметах, прэзентацыі вопыту работы, адкрытыя ўрокі і выхаваўчыя мерапрыемствы.

Прэзентацыю вопыту работы “Выкарыстанне алгарытмічных прадпісанняў для навучання вучняў рашэнню задач, афармленню ланцужкоў ператварэння рэчываў” прадставіць намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, настаўніца хіміі Церахоўскай сярэдняй школы № 2 Святлана Хузеева. Адкрыты ўрок з выкарыстаннем тэхналогіі асобасна-арыентаванага навучання правядзе для маладых спецыялістаў настаўніца рускай мовы і літаратуры гэтай жа школы Людміла Касцючэнка. Баршчоўскі дзіцячы садок-сярэдняя школа прадставіць увазе маладых настаўнікаў выхаваўчае мерапрыемства ў пачатковых класах “У свеце неверагоднага” пад кіраўніцтвам настаўніцы пачатковых класаў Святланы Машуковай. Прыняць удзел у майстар-класе ад настаўніцы пачатковых класаў Перароставскага дзіцячага садка-сярэдняй школы Надзеі Аксёнчыкавай па правядзенні пазакласных мерапрыемстваў для дашкольнікаў і вучняў пачатковых класаў змогуць тыя, хто жадае пераняць педагагічны вопыт. Кансультаванне па тэмах: “Арганізацыя самастойнай работы на ўроках матэматыкі” і “Арганізацыя пазакласнай работы па матэматыцы” правядзе для маладых спецыялістаў дырэктар Уцеўскай школы, настаўніца матэматыкі Ганна Станкевіч. Маладыя педагогі змогуць папрысутнічаць на адкрытым уроку настаўніцы беларускай мовы і літаратуры гэтай школы Наталлі Лакіза на тэму “Выкарыстанне інтэрактыўных тэхналогій на ўроках беларускай мовы”. Настаўніца абслугоўваючай працы СШ № 5 г. Добруша Ірына Ляўкова падрыхтавала для маладых калег майстар-клас “Пейзажная замалёўка”.

З мэтай удасканалення работы настаўнікаў-дэфектолагаў па стварэнні карэкцыйна-развіваючага асяроддзя для забеспячэння індывідуальна-арыентаванай карэкцыйна-педагагічнай дапамогі дзецям з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця аддзелам адукацыі райвыканкама і раённым цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі быў арганізаваны і праведзены раённы конкурс кабінетаў карэкцыйна-педагагічнай дапамогі ва ўстановах дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі. У ім прынялі ўдзел 20 педагогаў з 19 устаноў адукацыі.

Па выніках конкурсу яго пераможцамі сталі настаўнікі-дэфектолагі яслей-садка № 4 г. Добруша Алеся Кракадзеева і яслей-садка № 6 г. Добруша Наталля Сушко. Педагогі былі ўзнагароджаны дыпломамі І ступені. Дыпломы ІІ ступені атрымалі настаўнікі-дэфектолагі Церахоўскага дзіцячага садка Таццяна Дорашава і Насовіцкага дзіцячага садка-пачатковай школы Алена Асадчая. Наталля Ціпунова з Крупецкага дзіцячага садка-сярэдняй школы і Наталля Пабядзіна з Насовіцкай сярэдняй школы былі адзначаны дыпломамі ІІІ ступені.

Акрамя дыпломаў пераможцаў усе дыпламанты атрымалі прызы для папаўнення скарбонкі дыдактычных матэрыялаў у вучэбных кабінетах.

– Вельмі прыемна, што навуковыя і творчыя работы педагогаў гарадскіх і раённых школ не толькі знаходзяць водгук у спецыялізаваных выдавецтвах, але і з’яўляюцца канкурэнтаздольнымі на шматлікіх абласных і рэспубліканскіх конкурсах, – расказала Святлана Кавалёва. – Вось зусім нядаўна работы настаўніка гісторыі СШ № 2 г. Добруша Алены Васькаўцовай “Гульні на ўроках гісторыі” і настаўніка рускай мовы і літаратуры Жгунскай сярэдняй школы Людмілы Атрошчанка “Легенда аб алешыне”, якія атрымалі перамогу ў раённым туры абласнога конкурсу “Камп’ютар. Адукацыя. Інтэрнэт”, былі прадстаўлены для ўдзелу ў фінальным туры конкурсу. Яго вынікі будуць падведзены днямі.

Дарэчы, удзельнікі конкурсу маглі прадставіць свае работы па чатырох намінацыях: электронны адукацыйны рэсурс па вучэбным прадмеце, электронны сродак навучання ў спецыяльнай адукацыі, праектна-даследчая дзейнасць з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і выкарыстанне Web. 2.0 сэрвісаў у адукацыйным працэсе. У арганізацыйны камітэт і журы конкурсу ўвайшлі прадстаўнікі ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама і Гомельскага абласнога інстытута развіцця адукацыі.

Гэты конкурс быў арганізаваны сярод вучняў і педагогаў устаноў агульнай сярэдняй, прафесіянальна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Яго мэтай стала актывізацыя работы па выяўленні найбольш змястоўных і значных адукацыйных інфармацыйных рэсурсаў, папулярызацыя выкарыстання сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у адукацыі, развіццё інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу вучняў і педагогаў устаноў агульнай сярэдняй, прафесіянальна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

**Таццяна ПРЭЖЫНА**
**ФОТА Яўгена УСЦІНАВА**



Добрушскі край 16 студзеня 2013 г.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# Аднойчы і на ўсё жыццё

**Будынак Добрушскага раённага суда быў пабudаваны ў 1976 годзе. У той час суд называўся народным, яго структура была крыху спрошчанай у адрозненне ад сучаснага суда. Кіраваў ім старшыня, якому, у сваю чаргу, падпарадкоўваўся народны суддзя. Потым ішлі служба судовых выканаўцаў і канцылярыя суда.**

**Падрабязнасцямі аб тым, што ўяўляе сабой сёння сучасны суд, падзеліцца суддзя суда Добрушскага раёна Вольга СЫЧОВА.**

– Структура суда грунтоўна не змянілася, – расказала яна. – Толькі штаты пашырыліся. Кіруе судом, як і раней, старшыня, якому падпарадкоўваюцца зараз 2 суддзі. Дарэчы, суддзя прызначаецца на пасаду толькі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Служба судовых выканаўцаў налічвае 4 чалавекі. Далей ідуць сакратары судовага пасяджэння, іх у раённым судзе 3 чалавекі. Самастойнай адзінкай раённага суда з'яўляецца яго кансультант. Завяршае структуру канцылярыя суда.

**– Прафесія, якую Вы абралі аднойчы, безумоўна, вельмі складаная, адказная і шматгранная. Калі гаварыць аб асноўных функцыях, якія ўскладзены на суддзю, то ў чым яны заключаюцца?**

– У маёй кампетэнцыі знаходзіцца разгляд грамадзянскіх, крымінальных і адміністрацыйных спраў. Таксама я займаюся прапагандай прававой культуры сярод насельніцтва, прафілактыкай правапарушэнняў.

Пры разглядзе спраў па законе суддзя кіруецца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, згодна з якім ён праяўляе незалежнасць.

**– Судовыя выканаўцы, кансультанты суда і работнікі канцылярыі праводзяць прыём грамадзян і даюць юрыдычныя кансультацыі. Ці мае права займацца вырашэннем такіх пытанняў суддзя?**

– У адрозненне ад спецыялістаў іншых структур і арганізацый, суддзям правядзенне прыёму грамадзян забаронена. Таксама суддзі і работнікі суда не праводзяць кансультавання па прымяненні закона, каб пазбегнуць парушэння прынцыпу раўнапраўя бакоў.

У судзе можна атрымаць кансультацыі па пытаннях, якія звязаны з арганізацыяй і ходам судовага працэсу. Займаемся мы і разглядам заяў высокай сацыяльнай значнасці. Сюды адносяцца скасаванне шлюбу і спагнанне аліментаў. У холе нашага будынка знаходзіцца стэнд, на якім размяшчаецца інфармацыя аб пераліку неабходных дакументаў і ўзоры заяў.

**– Сёння ўсюды мяркуюць аб тым, што трэба прыкладаць намаганні, каб захаваць і зберагчы інстытут сям'і. Як складаецца справа па скасаванні шлюбаў у нашым раёне і які парадак дзеяннаў існуе для жадаючых разарваць сямейныя повязі?**

– На працягу 2012 года судом Добрушскага раёна было скасавана 150 шлюбаў. Працэдура скасавання вельмі простая. У суд падаецца платная заява аб жаданні скасаваць шлюб. Пры разглядзе справы суд вызначае віноўнага ў распадзе сям'і. На яго ў далейшым і ўскладаецца аплата дзяржаўнай пошліны.

Цікава, што раней усе пытанні, якія былі звязаны са скасаваннем шлюбаў, вырашаў толькі суд. Зараз, у сувязі са змяненнямі ў Кодэксе аб шлюбе і сям'і, якія з'явіліся ў ім з 1 студзеня 2013 года, шлюб можна будзе скасаваць у аддзеле загса райвыканкама. Але гэта будзе датычыцца толькі тых сем'яў, паміж супругамі ў якіх няма маёмасных прэтэнзій і непаўнагадовых дзяцей.

**– Пытанне аб скасаванні шлюбу аўтаматычна цягне за сабой вырашэнне спрэчак наконт аліментаў. Якім чынам ажыццяўляецца працэдура вызначэння іх памеру і парадак выплаты?**

– Каб спагнаць аліменты на выхаванне дзяцей, не заўсёды абавязкова трэба ісці ў суд. Супругі могуць дамовіцца паміж сабой аб іншым парадку спагнання аліментаў. Напрыклад, бацька можа адмовіцца ад долі кватэры ў кошт іх выплаты.

Памер аліментаў устанаўліваецца законам. Аліменты на непаўнагадовых дзяцей з іх бацькоў пры адсутнасці Пагаднення аб дзецях, Пагаднення аб выплаце аліментаў, а таксама, калі іх памер не вызначаны Шлюбным дагаворам, спаганяюцца ў наступных памерах: на адно дзіця – 25% , на двух дзяцей – 33%, на трох і больш дзяцей – 50% заробку і (або) іншага даходу бацькоў за месяц. Пры гэтым для працаздольных бацькоў мінімальны памер аліментаў павінен складаць не менш за 50% на адно дзіця, 75% – на двух дзяцей, 100% – на трох і больш дзяцей бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.

Памер аліментаў можа быць паменшаны судом, калі ў аднаго з бацькоў, які абавязаны іх выплачваць, ёсць іншыя непаўнагадовыя дзеці, якія пры спагнанні аліментаў ва ўстаноўленым сапраўдным артыкулам памеры апынуліся б меней забяспечанымі матэрыяльна, чым дзеці, якія атрымліваюць аліменты, а таксама ў выпадках, калі адзін з бацькоў, які выплачвае аліменты, з'яўляецца інвалідам I або II групы.

**– Калі гаварыць аб разглядзе спраў па грамадзянскіхісках, з якімі пытаннямі часцей за ўсё звяртаюцца ў суд?**

– Вельмі часта прыходзяць грамадзяне для вырашэння спрэчак па спадчыннай маёмасці. Гэта адбываецца ў тых выпадках, калі спадчыннікі не могуць дамовіцца па пытаннях раздзелу маёмасці.

У апошні час павялічылася колькасць іскаў да наймальнікаў прадпрыемстваў і арганізацый раёна. Гаворка тут ідзе аб незаконным звальненні работнікаў, незаконным выдanні загадаў і незаконных дысцыплінарных спагнаннях. Гэта адбываецца ў выніку некампетэнтнасці грамадзян у прававой і дакументальнай базе.

За апошні перыяд узрасла колькасць зваротаў грамадзян у суд па пытаннях абароны правоў спажыўцоў. Напрыклад, грамадзяне часам не могуць прад'явіць прэтэнзіі ў выпадку вырабу неякаснай мэблі, вокнаў, дзвярэй. Што датычыцца астатніх іскаў, то яны з'яўляюцца ў асноўным адзінкавымі. Дарэчы, за 2012 год Добрушскім раённым судом было разгледжана 870 грамадзянскіх спраў.

**– Кажуць, што прафесію выбіраюць аднойчы і на ўсё жыццё. Як ставіцеся Вы да такой жыццёвай аксіёмы?**

– У суд прыйшла працаваць у жніўні 1998 года ў якасці сакратара судовага пасяджэння. У 2004 годзе некаторы час паспела паспрабаваць сябе ў ролі судовага выканаўцы. Крыху пазней – дзяржаўнага натарыуса. Пасаду суддзі займаю з 2007 года.



Трэба прызнацца, юрыдычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны скончыла выдатна. Прафесіяй сваёй задаволена. Хаця за гэты час давялося папрацаваць выхавацелем у дзіцячым садку і карэспандэнтам у раённай газеце. Пазней адчула сэрцам, што спецыяльнасць юрыста мне даспадобы.

У нас малады і энергічны калектыў, які налічвае 16 чалавек. Сярод 13 жанчын працуюць 3 мужчын. З усімі калегамі падтрымліваю добразычлівыя адносіны.

Работу сваю люблю, таму і атрымліваю маральнае задавальненне ад рашэння канфліктных сітуацый. Упэўнена, што любы юрыст павінен быць добрым псіхолагам, тады і канфліктаў паміж людзьмі стане значна меней.

**Таццяна ПРЭЖЫНА**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

МЕРАПРЫЕМСТВЫ

# Каляда — госця жаданая





**(Заканчэнне. Пачатак – на 1 с.)**

(Заканчэнне. Пачатак – на 1 с.)

У мінулую нядзелю гарадская плошча нашага горада напоўнілася дарослымі і дзецьмі, якія прыйшлі сустрэцца з сябрамі і знаёмымі і стаць гледачамі тэатралізаванага прадстаўлення "Добры вечар, шчодры вечар", якое падрыхтавалі для дабрушан работнікі аддзела культуры райвыканкама.

Павіншаваць прысутных мерапрыемства прыйшла сама Каляда, якая зычыла ўсім дабра і радасці. Жартамі і вясёлымі забавамі парадавалі гледачоў скамарохі.

Неўзабаве на сцэну выскачыла Кікімара, якая вырашыла перашкодзіць святу. Яна дамовілася з Чортам выкрасці Каляду і выдаць сябе за яе. Пакуль Каляда сядзела ў склепе, Чорт разам з Кікімарай прыкінуліся гаспадарамі свята і сустракалі вясёлых калядоўшчыкаў, якія ўручалі ім падарункі. Кікімара прапанавала гасцям салёных лягушак, мухамораў, паукоў і чарвякоў. Але калядоўшчыкі адмовіліся ад такіх незвычайных пачастункаў і пакінулі хату.

З дапамогай забіяцкіх прыпевак і жартоўных танцаў новыя героі тэатралізацыі Каза і Мядзведзь дадалі запалу і весялосці ўдзельнікам свята.

Прадстаўленне было насычана калядными варожбамі, заліхвацкімі песнямі, гумарам і смехам.

Нарэшце Кікімары надакучыла сустракаць гасцей-калядоўшчыкаў і яна прызналася ўсім, што сапраўдная Каляда сядзіць запёртая ў склепе.

Героі тэатралізаванага прадстаўлення вывелі Каляду. Разам з астатнімі галоўная віноўніца ўрачыстасці частавала дзяцей і дарослых цукеркамі, жадала ўсім прысутным дабрабыту і шчасця ў хаце.

Калядная пастаноўка пакінула ў сэрцах гледачоў самыя шчырыя і цёплыя пачуцці нават нягледзячы на студзеньскі марозец. Атмасферу свята пазітыўнымі эмоцыямі папоўнілі канцэртныя нумары ў выкананні Валянціны Мендзелевай, Кацярыны Мядзведзевай, Алены Сушанавай, Юрыя Ерафеенкі, Міхаіла Сцепанцова і іншых выканаўцаў.

На дварэ быў ужо прыцемак. Але дзятва, што прыйшла на плошчу з татамі і мамамі, дзядулямі і бабулямі, весялілася каля навагодняй ёлкі. Хтосьці з'язджаў на санках з невысокай імправізаванай горкі, некаторыя рабяты зацікавіліся прадукцыяй, якой гандлявалі маладыя людзі ў перасоўных палатках. Чаго тут толькі не было: рознакаляровыя парыкі, бліскучыя чароўныя палачкі, святлопрамяняючыя цацкі розных памераў і формаў, паветраныя шарыкі ў выглядзе сардэчкаў. Да ёлкі спяшаліся маладыя хлопцы і дзяўчаты, якія былі пераапрануты ў касцюмы казачных герояў-калядоўшчыкаў.

Свята Старога Новага года не забудзецца людзьмі да тых пор, пакуль моладзь будзе пераймаць традыцыі ад сваіх дзядоў і бацькоў, пакуль не пакіне паважаць народныя звычаі і верыць у цуды.

**Таццяна ПРЭЖЫНА**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

МЕРАПРЫЕМСТВЫ

# Новы год да нас прыйшоў?

**У супрацоўнікаў тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання стала добрай традыцыяй адзначаць набліжэнне Старога Новага года разам з ветэранамі вайны і працы.**

Не адступілі ад традыцыі і сёлета. 11 студзеня ў памяшканні тэрытарыяльнага цэнтра сустракалі дарагіх гасцей. Самыя актыўныя сябры пярвічных ветэранскіх арганізацый у нефармальнай абстаноўцы весела і цікава правялі час за нетаропкай гутаркай, кубачкам гарачай кавы, удзелам ў шматлікіх выступленнях перад сваімі сябрамі і работнікамі ўстановы. Многія з ветэранаў адкрылі для прысутных невядомыя грані свайго таленту – ігра на музычных інструментах, выкананне песень, танцы. Жарты і смех суправаджалі выступленні самадзейных артыстаў. Таццяна Свірыдзенка прачытала прысутным свае новыя вершы.



Па словах дырэктара тэрытарыяльнага цэнра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Алены Алейнікавай, работнікі цэнтра ніколі не забываюць, які важкі ўклад у развіццё і абарону нашай дзяржавы ўнеслі ветэраны. А таму, кожная сустрэча з гэтымі заслужанымі людзьмі праходзіць у надзвычай цёплай, дамашняй абстаноўцы.

Вось і сёлета спецыялісты цэнтра падрыхтавалі гумарыстычную сцэнку з удзелам Дзеда Мароза, Снягуркі і Бабы Ягі. На развітанне старшыня раённай ветэранскай арганізацыі Уладзімір Філіпавіч Лузанаў ад імя ўсіх прысутных шчыра падзякаваў работнікаў тэрытарыяльнага цэнтра за выдатна арганізаваны вечар, любоў і спагаду да людзей старэйшага пакалення.

**Леанід ДУБОЎСКІ**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

ТЭХНІЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ ДЗЯЦЕЙ

# Даць жыццё творчаму праекту

**Рэспубліканская выстава тэхнічнай творчасці "Прарыў у будучыню" ў раздзеле "Архітэктурнае макетаванне" прынесла выхаванцам раённага цэнтра тэхнічнай творчасці дзяцей і моладзі трэцяе месца.**

Мэтай гэтай выставы з'яўлялася прыцягненне дзяцей і вучнёўскай моладзі да заняткаў навукова-тэхнічнай творчасцю, развіццё ў рабят вынаходніцкай і рацыяналізатарскай дзейнасці.

– Ідэю стварыць макет Кармянскай царквы выношвалі даўно, – расказаў педагог дадатковай адукацыі цэнтра, кіраўнік гуртка "Тэхнічнае канструяванне" Мікалай Суханаў. – Хацелася стварыць работу, якая адлюстроўвала б унікальнасць Добрушскага краю, яго культурную і духоўную спадчыну.

Каб даць жыццё творчаму праекту, гуртко ўцам давялося правесці падрыхтоўчую работу. Разам з кіраўніком выхаванцы цэнтра наведалі Кармянскую царкву, пагутарылі з настаяцелем, зрабілі шмат фотаздымкаў. Па прыездзе дадому рабяты абмяніліся думкамі, абмеркавалі з кіраўніком дэталі праекта, а потым прыступілі да распрацоўкі чарцяжоў.

Над макетам давялося працаваць на працягу двух гадоў, прычым у праекце прынялі ўдзел амаль усе наведвальнікі гуртка Мікалая Суханава.

– Найбольшую актыўнасць і энтузіязм у працэсе работы над праектам праявілі вучань 7 класа гарадской гімназіі Павел Яфрэмаў і вучань 6 класа СШ №3 г. Добруша Юрый Мархонаў, – падзяліўся кіраўнік гуртка. – Наша работа прайшла адбор у раённым і абласным турах рэспубліканскай выставы, якая прайшла ў Мінску. Падвядзенне яе вынікаў і ўзнагарода пераможцаў адбыліся напярэдадні навагодніх святаў.



**Таццяна ПРЭЖЫНА**

ШКОЛА ВЫЖИВАНИЯ

# Опасность погодных сюрпризов

